## Литература

*Барт Р.* Избранные работы: Семиотика. Поэтика. М., 1994.
*Лотман Ю.М.* Семиосфера. СПб., 2000.
*Blanche V. de la.* La Géographie Humaine. Paris, 1921.
*Flaubert G.* Voyage en Bretagne. Par les champs et par les grèves. Paris, 1989.
La France pittoresque, ou description pittoresque et statistique des départements et colonies de la France, par A. Hugo. Paris, 1835, 3 tomes.
*Maupassant G. de.* Contes de la bécasse. Paris, 1974.
*Salle L. de la.* Mémoire de deux voyages et séjours en Alsace, 1674-76 et 1681. Marseille, 1979.
*Tiesse A.-M.* Ecrire la France, le mouvement littéraire régionaliste de langue française entre la Belle Epoque et la Libération. Paris, 1991.


**А.А. БОСАК**

# *ДЫФЕРЭНЦЫЯЦЫЯ І АДМЕТНЫЯ АСАБЛІВАСЦІ НАРОДНЫХ ГАВОРАК ВЕРХНЯГА НАД'ЯСЕЛЬДЗЯ*

У сучаснай беларускай мове ёсць вялікая колькасць слоў і выразаў, ужыванне якіх абмежавана пэўнай мясцовасцю, тэрыторыяй і невядома ўсім прадстаўнікам беларускай нацыі. Такія словы называюцца дыялектнымі, а сама гаворка — дыялектам. Сукупнасць дыялектных слоў складае дыялектную лексіку. Дыялектныя словы і выразы вельмі часта ўжываюцца пісьменнікамі ў мастацкіх творах. У гэтым выпадку яны называюцца дыялектызмамі.

Багатая дыялектная лексіка беларускай мовы была і працягвае заставацца крыніцай папаўнення слоўніка літаратурнай мовы. У мове мастацкай літаратуры і публіцыстыкі дыялектызмы таксама шырока выкарыстоўваюцца як сродак моўнай характарыстыкі персанажаў, як неабходны элемент стылізацыі пры апісанні звычаяў, штодзённага побыту і жыцця людзей пэўнай мясцовасці [1, 2].

Пры вывучэнні тэрытарыяльнага вар'іравання сістэмы мовы ў Беларусі перш за ўсё вылучаецца асноўная яе тэрыторыя, асноўны масіў беларускай дыялектнай мовы, які супрацьстаўляецца яе невялікай паўднёва-заходняй частцы — заходнепалескай групе гаворак беларускай мовы [2—4].

Гаворкі Верхняга Над'ясельдзя (Пружанскі раён Брэсцкай вобласці і сумежжа) цікавыя тым, што знаходзяцца на стыку Беларускага Панямоння і Брэсцка-Пінскага Палесся. Сумежныя гаворкі адрозніваюцца разнастайнасцю мясцовых асаблівасцей, даследаванне якіх мае важнае значэнне для гісторыі беларускай мовы.

Па выніках праведзеных даследаванняў, якія ахапілі 231 населены пункт Пружанскага раёна і сумежжа, на тэрыторыі рэгіёна магчыма выдзеліць наступныя асноўныя гаворкі: гродзенска-баранавіцкія (панямонскія) (*ён будзе хадзіць у лес*), паўночнабрэсцкія акаючыя (*вон будзе хадзіці ў лес*), паўночнабрэсцкія окаючыя (*вон будзе ходзіці ў лес*), верхняясельдскія (*вуон будэ ходзіці ў ліес*), малецкія (*вуон будэ ходыты в ліес*), паўночназагародскія (*вун будэ ходыты в ліс*), сярэднезагародскія (*він будэ ходыты в ліс*).

**Гродзенска-баранавіцкая група гаворак** выдзелена ў 1964 г. Р.І. Аванесавым [5]. Гродзенска-баранавіцкая (панямонская) група гаворак адносіцца да паўднёва-заходняга дыялекту беларускай мовы. У Пружанскім раёне гаворкі гэтай групы пашыраны ў яго паўночна-ўсходняй частцы. Найбольш значнымі населенымі пунктамі, дзе распаўсюджаны гродзенска-баранавіцкія гаворкі, з'яўляюцца г.п. Ружаны, вёскі Блізная, Варанілавічы, Гута, Заполле, Зеляневічы, Кавалі, Калазубы, Лыскава, Паўлава. Гаворкі гродзенска-баранавіцкай (панямонскай)

---

*Алёна Анатольеўна БОСАК, асістэнт, выкладчык кафедры нямецкай мовы Беларускага дзяржаўнага эканамічнага універсітэта.*

групы блізкія па сваёй структуры да літаратурнай беларускай мовы [2, 6]. У прыватнасці, ім характэрна аканне (*галава, малако, карова*); мяккасць губных і пярэднеязычных перад рэфлексамі **е*, **і* (*бераг, пясок, зямля, сіла, зіма, вішня*); паслядоўнае цеканне-дзеканне (*дзень, дзікі, цяпер, ціха*); неазначальная форма дзеясловаў на *-ць* (*рабіць, мыць, пісаць, хадзіць*); займеннікі 3-й асобы *ён, яна, яно, яны*.

**Паўночнабрэсцкія гаворкі**, якія ў 1968 г. упершыню выдзелены Н.Т. Вайтовіч, пашыраны ў паўночна-заходняй частцы Пружанскага раёна [7]. Яны падзяляюцца на ***окаючыя*** (Шарашова, Вялікія Якавічы, Гарадняны, Дабучын, Кацёлкі, Шані) і ***акаючыя*** (Вялікае Сяло, Купічы, Крыніца, Мурава, Роўбіцк, Папялёва, Стараволя, Сухопаль, Чадзель). Паўночнабрэсцкім окаючым гаворкам характэрна паслядоўнае оканне (*голова, молоко, корова, ходзіці*), паўночнабрэсцкім акаючым — аканне (*галава, малако, карова, хадзіці*). У паўночнабрэсцкіх гаворках паслядоўнае цеканне-дзеканне (*дзень, ідзе, ціхо*); пярэднеязычныя мяккія перад рэфлексамі **е*, **і* (*земля, село, сіла, зіма*); губныя мяккія перад рэфлексамі **і* (*вішня, піла, міска*); губныя цвёрдыя (ў большасці гаворак) перад рэфлексамі **е* (*пасок, машок, васна, пэсок, мэшок, вэсна*), пратэтычны *в* у займенніках 3-й асобы (*вон, вона (вана), воны (ваны)*); неазначальная форма дзеясловаў на *-ці* (*робіці, рабіці, мыці, пісаці*); характэрна “саканне” (*напіўса, умываціса*).

**Верхнясельдскія гаворкі** пашыраны ў цэнтральнай, усходняй і паўднёва-ўсходняй частках Пружанскага раёна (Аранчыцы, Бакуны, Загор’е, Лінова, Мокрае, Піняны, Руднікі, Смаляніца, Смаляны, Труханавічы, Харава, Чахец). Верхнясельдскім гаворкам характэрны наступныя рысы: паслядоўнае оканне (*молоко, голова, корова*); перад рэфлексамі **е* пярэднеязычныя (акрамя *л*) і губныя вымаўляюцца цвёрда (*зэмля, сэло, дэнь, пэсок, мэшок, нэбо*); перад рэфлексамі **і* пярэднеязычныя і губныя вымаўляюцца мякка (*зіма, сіла, піла, вішня, міска*); на месцы **ê* пад націскам вымаўляецца дыфтонг *іе* (*сіено, ліес*); на месцы **о* ў новых закрытых складах пад націскам вымаўляецца дыфтонг *уо* (*стуог, куонь, вуон*); *неазначальная форма дзеясловаў на -ці* (*робіці, мыці, пісаці*); “саканне” (*напіўса, умываціса*). Выдзелена верхнясельдская група гаворак як асобная дыялектная адзінка Ф.Д. Клімчуком [3].

У **малецкіх гаворках**, якія ў Пружанскім раёне характэрны для вёскі Обеч (паўднёва-ўсходняя частка раёна), зычныя *б, в, м, п, д, т, з, с, н* перад рэфлексамі **е*, **і* вымаўляюцца цвёрда (*бэда, вэсна, мэшок, пэсок, дэнь, тэпло, зыма, сыла, ныва*); на месцы **ê* пад націскам вымаўляецца дыфтонг *іе* (*сіено, ліес*); на месцы **о* ў новых закрытых складах пад націскам вымаўляецца дыфтонг *уо* (*стуог, куонь, вуон*); неазначальная форма дзеясловаў на *-ты* (*робыты, мыты, пысаты*); характэрна “саканне” (*напывса, умыватыса*). Малецкія гаворкі ўпершыню выдзелены І.І. Зянько [8].

У **паўночна-** і **сярэднезагародскіх гаворках**, выдзеленых Ф.Д.Клімчуком, зычныя *б, в, м, п, д, т, з, с, н* перад рэфлексамі **е*, **і* вымаўляюцца цвёрда (*бэда, высна, мышок, пысок, дэнь, тэпло, зыма, сыла, ныва*); на месцы **ê* пад націскам выступае *і* (*сіно, ліс, літо*); на месцы **о* ў новых закрытых складах пад націскам у паўночназагародскіх гаворках вымаўляецца *у* (*стуг, кунь, вун*), у сярэднезагародскіх — *і, ы* (*стыг, кінь, він*); неазначальная форма дзеясловаў на *-ты* (*робыты, рубыты, мыты, пысаты*); “саканне” адсутнічае (*напывся, умыватысь*). Паўночназагародскія гаворкі ў Пружанскім раёне лакалізуюцца ў вёсках Брады, Гарадзечна, Лібія, Паддубна, Прылучына, Шчэрбы (паўднёвая частка раёна), сярэднезагародскія — Галасяціна, Казакі, Старуны, Чабахі, Шчарчова (паўднёва-заходняя частка раёна).

## Літаратура


1. *Камароўскі Я.М., Мяцельская Е.С.* Беларуская мова. Мн., 1993.
2. *Крывіцкі А.А.* Дыялекталогія беларускай мовы. Мн., 2003.
3. *Клімчук Ф.Д.* Гаворкі Заходняга Палесся. Мн., 1983.
4. *Клімчук Ф.Д.* Заходнепалескія гаворкі // Беларус. мова: Энцыклапедыя. Мн., 1994.
5. *Аванесаў Р.І.* Групоўка дыялектаў беларускай мовы // Нарысы па беларускай дыялекталогіі. Мн., 1964.
6. *Крывіцкі А.А., Падлужны А.І.* Фанетыка беларускай мовы. Мн., 1984.
7. *Вайтовіч Н.Т.* Ненаціскны вакалізм народных гаворак Беларусі. Мн., 1968.
8. *Зянько І.І.* Важнейшыя асаблівасці фанетычнай сістэмы і граматычнага ладу гаворак Пружанскага раёна Брэсцкай вобласці // Пр. Ін-та мовазнаўства АН БССР: Вып. III. Мн., 1957.